# АДНОСІНЫ ПАМІЖ МЕДЫКАМІ Ў ПРАЦОЎНЫМ КАЛЕКТЫВЕ (НА ПРЫКЛАДЗЕ АПОВЕСЦІ А.ФЕДАРЭНКІ “ЛАНЦУГ”)

УА «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
**Ушакова В.А., Сяргеева Т.А., студэнткі 3 курса стаматалагічнага факультэта**
Кафедра беларускай і рускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Ратынская Н.В.

“Ланцуг” – гэта цікавы, захапляльны і павучальны твор А. Федарэнкі. Аповесць расказвае пра падзеі з жыцця медыкаў, закранаючы пры гэтым пытанні ўрачэбнай этыкі, праблемы ўзаемаадносін паміж медыкамі, а таксама пытанні агульначалавечай маралі. У цэнтры ўвагі – Іван Змітравіч Стэльмах, стары вопытны хірург “у белым пакамечаным халаце, тоўсты, вялікі, у акулярах, з сівой шчоткай жорсткіх нават на выгляд валасоў” і галоўны герой аповесці Яўген Вінярскі – асістэнт Стэльмаха, нядаўні выпускнік медыцынскага інстытута, высокі прыгожы хлопец гадоў дваццаці васьмі з доўгімі чорнымі валасамі, сабранымі ў касічку, падобны тварам да дзяўчыны. Свайго настаўніка Стэльмаха ён не палюбіў адразу ж, з першай сустрэчы. Прычын, каб не любіць, было хоць адбаўляй: Іван Змітравіч быў неахайны, рассеяны, сквапны, абедаў у клінічнай сталоўцы і ўмудраўся перабівацца малочным супам з алюмініевай міскі і шклянкай кефіру з чорным хлебам; апранаўся заўсёды ў нязменны карычневы касцюм, у адну і тую ж цёмную кашулю, без гальштука, насіў адны і тыя ж, нячышчаныя чаравікі... Усё гэта выклікала агіду ў Яўгена, да старога доктара ён адносіўся ледзь не з пагардай. Іван Змітравіч ні пра што не здагадваўся, ён паважаў Вінярскага, стараўся паддобрыцца да яго, раіўся ва ўсім – быццам не ён, а Вінярскі за яго быў старэйшы ў два разы. “Жэня, я да цябе прывык, ты мне як родны сын. Я паважаю цябе, я ж бачу, што ты ў дзесяць разоў разумнейшы за мяне” – казаў Стэльмах. Але Вінярскаму гэтая добрасць была асабліва непрыемная.

Ужо ў самым пачатку аповесці мы бачым, як ставіцца галоўны герой Вінярскі да ўсяго, што адбываецца вакол: да людзей, да месца сваёй працы, да жыцця. Малады ўрач марыць з’ехаць за мяжу, бо сваю клініку ён цярпець не можа – нават пра клінічную сталоўку думае з нянавісцю і агідай. Увогуле, Яўген не любіць людзей. Ён бачыць у іх вачах толькі працейшыя жывёльныя інстынкты: уплішчыцца ў тралейбус, дабрацца да ларка, да разбаўленага піва – гэта ў мужчын; у растаўсцелых жанчын – дапасці да нейкай чаргі, адстаяць, пасварыцца... Гэтыя людзі нагадваюць Вінярскаму пра яго пацыентаў – з загноенымі дзіркамі на руках і нагах, з пакрыўленымі, няправільна зрослымі пасля пераломаў касцямі, з апухлымі, з выродлівымі, як шары, фурункуламі... І ў гэтых вачах Яўген бачыць тое ж жывёльнае: выратуй, пазбаў ад болю, выпусці гной, накладзі швы, здымі рожу...

Таму лепшай прафесіяй для сябе Вінярскі лічыць медыцыну, бо ўсе вялікія ці проста добрыя ўрачы-хірургі, якіх ён ведае, ці пра якіх чуў у інстытуце на лекцыях, былі жорсткія. Ён ніколі не пашкадаваў ніводнага свайго

Рэпазіторый БДМУ

пацыента, заўсёды адчуваў да іх толькі агіду, яны былі для яго менавіта пацыенты, а не жывыя людзі.

З іншага боку мы бачым, як самі пацыенты, на прыкладзе Васіля, жаніха Стэльмахавай дачкі, апісваюць адносіны медыкаў да іх. Васіль апісвае свае пакуты, праз якія ён прайшоў, зламаўшы нагу і трапіўшы у аддзяленне да Вінярскага. У час абходу Вінярскі моўчкі запісвае нешта ў сшытак і збіраецца ісці. Васіль пытае, колькі яму яшчэ ляжаць тут і атрымлівае абыякавы адказ: ”Колькі патрэбна.” “Я рвуся, ледзь не падаю з ложка, каб хоць на секунду затрымаць: «Я не спаў ноч, дайце, калі ласка, укол!..» – «Папрасіце сястру». Дзе яна, тая сястра, хоць бы пабачыць яе!.. Не столькі хачу ўколу, колькі таго, каб чалавек з касічкаю хоць на міг прысеў побач, зразумеў, што яшчэ ўчора быў вечар і бэз пад акном, стос белых лістоў і пахі расы – а сёння смурод ад невынесеных суднаў, страшная санітарка, спірт... Толькі б гэта неяк зразумеў чалавек у белым халаце і сказаў бы пару слоў: «Усё мінецца, праз дзень, ці праз тыдзень, ці праз месяц зноў будзе ў цябе і вечар, і бэз пад акном...» Але не прысеў, не сказаў – і след прастыў чалавека ў белым халаце, з касічкаю...” – расказвае Васіль. Потым наступае другая раніца – з санітаркаю, пахмелкай спіртам, другі абход. Ізноў Вінярскі, ледзь паказаўшыся на парозе, паварочваецца сыходзіць. Васіль просіць: «Доктар, пазваніце на працу, скажыце там, дзе я!» Просьба разбіваецца аб зачыненыя дзверы... Васіль не разумее, як можна быць такім абыякавым да людзей, і не мае значэння, якія яны – п’яныя, дурныя, несімпатычныя табе – бо ты стаў урачом, даваў клятву Гіпакрата. “Ды хоць зірні ты інакш, скажы хоць адно добрае слова, абнадзей – гэта будзе ў сто разоў лепш за любыя лекі. Я магу зразумець жорсткасць наглядчыкаў у турме, але жорсткасць, нелюдзімасць урачоў – вышэй усялякага разумення. Вашая клініка – гэта ж зона, турма, у якой няшчасныя людзі мучаюцца, самі не ведаючы за што, а вы – наглядчыкі – спакойна ходзіце па вуліцах, глядзіце тэлевізары, спакойна ядзіце, п’яце...”

Аўтар супрацьпастаўляе маладому самаўлюблёнаму Вінярскаму ўрача “старой загартоўкі” Стэльмаха, аб чым мы даведваемся таксама з маналогу Васіля: “Што Стэльмах убачыў у маіх вачах – не ведаю, бо я не казаў ані слова, ляжаў, да ўсяго атупелы, але мяне раптам перавялі ў палату на два месцы, прыбегла сястра, зрабіла ўкол, я праспаў цэлыя суткі, а тады, пад вечар, прыехалі хлопцы таксоўкаю і завезлі мяне дамоў. Гэта Стэльмах глянуў на запіс, зроблены ў прыёмным пакоі, даведаўся тэлефон рэдакцыі, дзе я працую, і пазваніў. Усяго толькі!”

Такім чынам мы, як будучыя медыкі, прачытаўшы твор Андрэя Федарэнкі зрабілі высновы, што нельга быць жорсткімі і бясчалавечнымі да сваіх пацыентаў, як Вінярскі; што ўрач павінен быць чымсьці большым, чым бессардэчная каменная глыба з халодным розумам і медыцынскімі ведамі; што нягледзячы ні на становішча чалавека, ні на яго знешнасць, трэба адносіцца з павагай да кожнага, хто прыйшоў да цябе з надзеяй атрымаць падтрымку калі не лекамі, то словамі. У нашых сілах заверыць хворага, бездапаможнага ў тым, што ўсё тое, што адбываецца зараз, гэта часова і далей будзе значна лепш. А і на самой справе – хіба гэта так складана?



Репозиторий ГрГМУ